# МІНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ
# (29 ЧЭРВЕНЯ – 4 ЛІПЕНЯ 1944)

**Мінская аперацыя** (29 чэрвеня – 4 ліпеня 1944), наступальная аперацыя войск 3-га (генерал арміі І. Д. Чарняхоўскі), 2-га (генерал-палкоўнік Г. Ф. Захараў), 1-га (Маршал Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскі), Беларускіх франтоў пры садзеянні 1-га Прыбалтыйскага фронту (генерал арміі І. Х. Баграмян), састаўная частка Беларускай аперацыі 1944.

Удзельнічалі: 5-я (генерал-лейтэнант М. І. Крылоў), 11-я (генерал-палкоўнік К. М. Галіцкі), 31-я (генерал-лейтэнант В. В. Глаголеў), 5-я гвардзейская танкавая (маршал бронетанк. войск П. А. Ротмістраў), 1-я паветраная (генерал-палкоўнік авіяцыі Ц. Ц. Хрукін) арміі, конна-механізаваная група (генерал-лейтэнант М. С. Аслікоўскі), 2-і гвардзейскі танкавы корпус (генерал-маёр танк. войск А. С. Бурдзейны) 3-га Беларускага фронту; 33-я (генерал-лейтэнант В. Дз. Кручонкін), 49-я (генерал-лейтэнант І. Ц. Грышын), 50-я (генерал-лейтэнант І. В. Болдзін), 4-я паветраныя (генерал-палкоўнік авіяцыі К. А. Вяршынін) арміі 2-га Беларускага фронту; 3-я (генерал-палкоўнік А. В. Гарбатаў), 48-я (генерал-лейтэнант П. Л. Раманенка), 16-я паветраная (генерал-палкоўнік авіяцыі С. І. Рудэнка) арміі, конна-механізаваная група (генерал-лейтэнант І. А. Плієў) 1-га Беларускага фронту.

У выніку ажыццяўлення Віцебска-Аршанскай, Магілёўскай і Бабруйскай аперацый 1944 нямецкая 4-я і частка сіл 9-й армій групы армій «Цэнтр» апынуліся ў паўкольцы глыбока ахопленыя савецкімі войскамі. Да зыходу 28 чэрвеня войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту вялі баі на подступах да Полацка і на рубяжы Заазер'е – Лепель, войскі 3-га Беларускага фронту падышлі да р. Бярэзіна (у раёне Барысава), ахопліваючы праціўніка з Пн, войскі 2-га Беларускага фронту наступалі з У з міжрэчча Дняпра і Друці, не даючы магчымасці нямецкім войскам адарвацца і арганізавана адступіць да Бярэзіны, войскі 1-га Беларускага фронту, зламаўшы абарону нямецка-фашысцкіх войск на Бярэзіне (у раёне Бабруйска), выйшлі на рубеж на У ад Свіслачы і Асіповіч, ахапіўшы праціўніка з Пд. Рухомыя злучэнні франтоў, якія дзейнічалі ў раёнах Барысава і Асіповіч, знаходзіліся за 100 км ад Мінска, у той час як галоўныя сілы праціўніка, што адыходзілі да Мінска, за 130–150 км ад яго. У гэтых умовах савецкае камандаванне ставіла задачу: імклівымі ўдарамі войск левага крыла 3-га Беларускага фронту і часткі сіл правага крыла 1-га Беларускага фронту па збежных напрамках на Мінск ва ўзаемадзеянні з 2-м Беларускім фронтам завяршыць акружэнне групоўкі войск праціўніка і вызваліць Мінск. Адначасова войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту правага крыла 3-га Беларускага фронту і частка сіл 1-га Беларускага фронту павінны былі працягваць імклівае наступленне на З, знішчыць падыходзячыя рэзервы праціўніка і стварыць умовы для развіцця наступлення на шаўляйскім, каўнаскім і варшаўскім напрамках. Войскі 3-га Беларускага фронту 30 чэрвеня галоўнымі сіламі фарсіравалі Бярэзіну, разбілі барысаўскую групоўку гітлераўцаў, 1 ліпеня вызвалілі Барысаў, Бягомль, 2 ліпеня – Лагойск, Смалявічы, Вілейку, Краснае, перарэзалі чыгунку Мінск – Вільнюс. Войскі 1-га Беларускага фронту 30 чэрвеня вызвалілі Любань, Слуцк, 2 ліпеня – Стоўбцы, Гарадзею, перарэзалі чыгунку Мінск – Баранавічы. Адначасова ў напрамку Мінска наступалі войскі 2-га Беларускага фронту, якія 29 чэрвеня вызвалілі Бялынічы, 2 ліпеня – Чэрвень, 3 ліпеня – Беразіно. Рухомыя злучэнні 1-га Беларускага фронту ў ноч на 3 ліпеня абышлі Мінск з Пд, выйшлі да паўднёва-ўсходнія ўскраіны горада, дзе злучыліся з войскамі 3-га Беларускага фронту. Вырашальны ўдар па варожым гарнізоне ў Мінску, які складаўся

з 3 пяхотных і 1 танкавай дывізій, 3 палкоў СС і розных спец. падраздзяленняў, быў нанесены на досвітку 3 ліпеня. З У і ПнУ у горад уварваўся 2-і гвардзейскі танкавы корпус, з Пн увайшлі часці 5-й гвардзейскай танкавай арміі і перадавыя падраздзяленні 11-й гвардзейскай і 31-й армій 3-га Беларускага фронту, у сярэдзіне дня з ПдУ – 1-ы гвардзейскі танкавы корпус і часці 3-й арміі 1-га Беларускага фронту. У 2-й палове дня 3.7.1944 Мінск быў поўнасцю вызвалены. На У ад горада былі акружаны галоўныя сілы 4-й і асобныя злучэнні 9-й нямецкай армій, у мінскі «кацёл», які ўтварыўся, трапілі 105 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка, да 11 ліпеня групоўка была разгромлена. У час правядзення Мінскай аперацыі савецкая авіяцыя ўтрымлівала перавагу ў паветры, наносіла па ворагу магутныя ўдары, перашкоджвала падыходу рэзерваў праціўніка, дэзарганізоўвала планамернае адступленне яго войск. 4 ліпеня войскі 3-га і 1-га Беларускага франтоў дасягнулі рубяжу воз. Нарач – Маладзечна на З ад Стоўбцаў, вызвалілі Нясвіж. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту, якія дзейнічалі на стыку 2 груп нямецка-фашысцкіх армій і забяспечылі правядзенне Мінскай аперацыі, надзейна ізалявалі групу армій «Поўнач» і не далі ёй магчымасці прыйсці на дапамогу групе армій «Цэнтр», 4 ліпеня выйшлі на лінію на З ад Варапаева – воз. Мядзел. У ажыццяўленні аперацыі вялікую дапамогу войскам аказвалі партызаны брыгад імя Шчорса, імя газеты «Правда», «Дзядзькі Колі», «Штурмавая», «Жалязняк», «Бальшавік», 1-й і 2-й Мінскіх, імя Чкалава і інш. 53 злучэнням і часцям, якія вызначыліся ў аперацыі, нададзены ганаровыя найменні «Мінскіх», 13 – «Барысаўскіх», 8 – «Слуцкіх».

**ЛІТАРАТУРА**


1. **Акалович, Н. М.** И враг не прошел : о 873-м Смоленском истребительно-противотанковом артиллерийском полке / Н. М. Акалович. – Мн. : Наука и техника, 1984. – 87 с.
2. **Беларусь** у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 361–362.
3. **Лемяшонак, У.** Мінская аперацыя 1944 / У. Лемяшонак // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1999. – Т. 5. – С. 171–172.
4. **Операция** «Багратион». Освобождение Белоруссии / авт. коллектив: В. А. Жилин [и др.]. – М. : ОЛМА-ПРЕСС, 2004. – 488 с. – (Архив).